

Распачынаецца новы навучальны год ва ўсіх навучальных установах. У Гродзенскай семінарыі пачатак навучання некалькі адрозніваецца ад іншых устаноў – спачатку семінарысты возьмуць удзел у рэкалекцыях, а першакурснікі пройдуць 10-дзённы падрыхтоўчы курс. З якімі зменамі і якім настроем распачынае чарговы навучальны год Гродзенская вышэйшая духоўная семінарыя, мы распыталі яе рэктара кс. Юзафа Станеўскага.

- *Ваша Магніфіцэнцыя, як бы Вы ацанілі ўзровень падрыхтаванасці сёлетніх першакурснікаў да навучання ў духоўнай семінарыі?*

- Надзвычай добра. Я вельмі задаволены тым, наколькі маладыя людзі валодаюць ведамі Святога Пісання, па асноўных праўдах каталіцкага веравызнання, жыцця Касцёла, пытаннях маралі. Я бачу, што ўзровень катэхізацыі ў нашай дыяцэзіі вельмі высокі, і падаецца, што ў гэтых алюмнаў не будзе праблем з навучаннем у нашай установе.

- *Ці ёсць нейкія змены ў сёлетняй праграме навучання Гродзенскай ВДС?*

- Мы стала працуем па зацверджанай Ватыканам навучальнай праграме. Аднак, кожны прафесар уносіць нейкія свае індывідуальныя моманты. Зараз выкладчыкі ўсё больш выкарыстоўваць элементы мультымедыйнасці і інтэрактыўнасці падчас працэсу навучання.

- *А ці будуць змены ў кадрах*?

- Так. З гэтага навучальнага года ў нашай семінарыі распачне служэнне новы духоўны айцец – кс. Валерый Быкоўскі, кс. Ян Сарэла з’язджае на працу ў парафію ў Воўпу. Таксама прыязджае новы прафесар – кс. Андрэй Зноска, які скончыў юрыдычны факультэт БДУ ў Мінску і будзе выкладаць у нашых алюмнаў канфесійнае права.

- *Кс. Юзаф, падчас I Кангрэса каталіцкіх СМІ кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч у сваім дакладзе сярод іншага звярнуў увагу на неабходнасць прадугледзець медыйнае выхаванне для семінарыстаў. Ці будзе звернута ўвага на гэты кампанент навучання ў Гродзенскай ВДС?*

- У нас ужо вядуцца такія заняткі. Кс. Павел Салабуда праводзіць заняткі для

семінарыстаў па мас-медыях, навучэнцы пішуць артыкулы, таму будзем проста далей удасканальваць гэты кампанент.

- *Дзякуй за размову!*